рэлігійных, часам больш значная ў параўнанні з нормамі «ўласнага» права. Аднак аднясенне гэтых нацыянальных прававых сістэм да рамана-германскай прававой сям'і альбо да сям'і агульнага права часам не адпавядае рэальнаму стану іх функцыянавання.

На наш погляд, ідэі, якія запазычваюцца паспяхова, не прыходзяць у прававую сістэму аднахвілінна, бо каб пэўная з'ява стала часткай прававой сістэмы, павінна паўстаць натуральная неабходнасць. Пры яе адсутнасці ўніфікацыя ў прынцыпе немагчымая, нават калі вонкава (праз штучны закон) яна будзе ствараецца. Тое самае можна казаць у адносінах да папулярных прававых глабалізацыйных тэм правоў чалавека і экалагічных правоў насельніцтва, дзе не кожная запазычаная норма прыжывецца ў грамадстве.

Мы прыходзім да высновы, што для прававой сістэмы важнымі крытэрыямі адрознення з'яўляюцца менавіта культурна-каштоўнасныя катэгорыі. Важна тое, як у грамадстве прынята ўспрымаць права, ці ёсць у пэўных супольнасцей якая-небудзь матывацыя прымаць нормы, якія прыйшлі звонку? Апора на традыцыю – сутнасць існавання грамадства як асобнага нацыянальнага суб'екта. Але падкрэслім, што гэтае сцверджанне не абапіраецца на абавязкова пазітыўную ацэнку традыцый. Канстатацыя гэтага факта ў чарговы раз пацвярджае словы Э. Бёрка: «Тыя, хто не азіраецца на продкаў, не заглядваюць наперад сваіх нашчадкаў».

***Грыбовіч Ю. Ю.***

## ПОЛЬСКІЯ ІДЭАЛАГІЧНЫЯ ПРЭТЭНЗІІ НА БЕЛАРУСЬ У XX ст.

*Грыбовіч Юлія Юр'еўна, студэнтка 3 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, juliagri0608@gmail.com*
*Навуковы кіраўнік: канд. юр. навук, дацэнт Калінін С. А.*

Гісторыя развіцця беларускай дзяржаўнасці ў лінейным разуменні не была адназначнай. Прэамбула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь спасылаецца на шматвекавую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці, а не на яе шматвекавую гісторыю. Такія складанасці разумення абумоўлены, на нашу думку, ў першую чаргу тым, што фарміраванне ўласнай нацыянальнай дзяржавы на беларускіх землях пачалося ў паслярэвалюцыйны перыяд. Але наяўнасць дзяржаўнасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі або на этнічна блізкіх землях, ў тым ліку ў межах Рэчы Паспалітай, Расіі, Польшчы, або ў межах іх тэрытарыяльных, ідэалагічных і цывілізацыйных прэтэнзій дазваляе ставіць пытанне аб яе дачыненні да сучаснай беларускай дзяржавы.

Беларуская дзяржаўнасць складана перасякаецца з дзяржаўнасцямі мяжуючых з Беларуссю краін, кожная з якіх прэтэндуе на беларускую дзяржаўнасць як на сваю ўласную спадчыну. Адным з найбольш актыўных «спадчыннікаў» з'яўляецца Польшча. Становішча Польшчы пасля Першай сусветнай вайны было абцяжарана невызначанасцю яе межаў, яны ўсталяваліся

толькі ў выніку савецка-польскай вайны і Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. Заходнія краіны і СССР разглядалі Польшчу буфернай дзяржавай паміж дзвюх цывілізацый – заходняй і ўсходняй. Для яе такая сітуацыя была зусім не спрыяльнай, таму Польшча спрабавала вырашыць праблему непажаданага статусу на міжнароднай арэне, ў тым ліку праз усходнія кірункі знешняй палітыкі. Уласцівая польскаму палітычнаму мысленню ідэнтыфікацыя сябе як прасторы паміж немцамі і рускімі абумоўлівае яшчэ адну сутнасную рысу: Польшча бачыць сябе рэгіянальнай дзяржавай, лідэрам дзяржаў гэтага рэгіёна.

Адным са знакавых польскіх палітычных дзеячаў міжваеннага перыяду быў Юзаф Пілсудскі. Яго дактрына «польскага праметэізму» галоўным кірункам сусветнай палітыкі бачыла барацьбу супраць «усходняга варварства» Расіі (СССР). Задачай аўтары дактрыны бачылі раз’яднанне сацыялістычных краін праз уздзеянне на нацыянальна-арыентаваныя слаі насельніцтва, якім патрэбна была «дапамога» для вызвалення ад імперыялістычнай Расіі. Далей Польшча павінна была выконваць ролю апекуна і абаронцы вызваленых народаў, адным з такіх народаў яна бачыла і Беларусь, у выніку Польшча станавілася лідэрам шматнацыянальнай федэрацыі, якая ўтварылася б на месцы Расіі.

Палітыка пацыфікацыі, якая ў міжваенны час была разгорнута ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне ўрадам Пілсудскага, таксама вартая ўвагі. Толькі аформіўшы свае межы, Польскае кіраўніцтва палічыла неабходным канчаткова «прывязаць» новыя землі да сябе, пачаўся тэрор і татальная паланізацыя. У такіх умовах беларусы апынуліся адной з нацыянальных меншасцей, у дачыненні да якіх праводзілася палітыка «культурнага падаўлення». Дзейнічала таемная паліцыя – дыфензіва, знішчаліся вёскі, зачыняліся беларускія школы, праводзілася рэвіндыкацыя праваслаўных цэркваў. У 1934 г. польскі ўрад з трыбуны Лігі Нацый афіцыйна адмовіўся ад трактата «Аб нацыянальных меншасцях», прынятага ім у 1919 г. У гэтым жа годзе санацыйныя ўлады прынялі закон «Аб ізаляцыі грамадска-небяспечных элементаў», палітычная апазіцыя праследавалася прававымі сродкамі і сілавымі метадамі. У Бярозе-Картузскай быў створаны канцэнтрацыйны лагер для палітычных вязняў, праца ў ім была наўмысна бескарыснай і накіраванай выключна на знявагу гонару вязняў.

Пасля Другой сусветнай вайны распаўсюдзілася дактрына Гедройца-Мірашэўскага, у адрозненне ад ідэй праметэізму яна акцэнтавала ўвагу на тым, што мяжуе ўжо не непасрэдна с Расіяй, і вылучала Беларусь, Літву і Украіну як самастойныя дзяржавы (так званы рэгіён ULB), уплыў Расіі на якія было неабходна абмежаваць. Польшча пазіцыянуе сябе як носьбіта ідэй волі і дэмакратыі, таму, згодна з гэтай дактрынай, яе пратэкцыя над краінамі рэгіёна ULB павінна выглядаць значна больш прымальнай у параўнанні з прыгнётам, зыходзячым ад імперыялістычнай Расіі.

Яшчэ адным альтэрнатыўным кірункам польскага палітычнага мыслення з’яўляецца канцэпцыя «Міжмор’я», згодна з якой «Міжмор’е» – рэгіён паміж Балтыйскім, Чорным і Адрыятычным морамі, краіны якога павінны аб’яднацца

ў федэрацыю, каб не дапусціць дамінавання ў Еўропе Германіі або Расіі, а Польшчы адводзілася роля лідэра. Канцэпцыя ўзнікла таксама пры Юзафе Пілсудскім, але ў той час шырока распаўсюджана не была. Яна актуалізавалася пасля таго, як спыніў існаванне сацыялістычны лагер і цэнтральнаеўрапейскія краіны пачалі ўваходзіць у іншыя еўрапейскія інтэграцыі. У Польшчы ідэі стварэння Міжмор'я, а таксама адраджэння былой Рэчы Паспалітай шырока распаўсюджаны, у тым ліку сярод палітычнага кіраўніцтва. Гэты факт неаднаразова адзначаўся ў друку. Напачатку 2010 г. з'явіўся шматмоўны праект Новая Рэч Паспалітая, прысвечаны адраджэнню Рэчы Паспалітай, у якую могуць увайсці Беларусь, Латвія, Літва, Польшча, Украіна.

З аналізу прыведзеных канцэпцый вынікае, што хаця польская палітыка ў адносінах да тэрыторый сучаснай Беларусі з цягам часу змякчалася, Польшча працягвае ўспрымаць Беларусь не як самастойнага і роўнага суб'екта міжнародных адносін, а як аб'ект, праз які можна рэалізоўваць уласную палітыку.

***Дубешко Т. В.***

## ИМПЕРИЯ КАК ФОРМА ГОСУДАРСТВА

*Дубешко Татьяна Владимировна, студентка 3 курса Белорусского государственного университета, г. Минск, Беларусь,* dubeshkotatyana@gmail.com
*Научный руководитель: канд. юрид. наук, доцент Калинин С. А.*

Исторически наиболее распространенным способом интеграции различных политических образований в Античности, Средневековье и Новое время выступал феномен империи, который, с одной стороны, утратил свое значение после Первой мировой войны. Однако отказ от территориальной имперской интеграции, с другой стороны, породил феномен империй нового типа – глобальные империи, информационные империи и т. д., отражающих сложившуюся в силу колониального раздела мира дуальную систему стран «золотого миллиарда» и «третьего мира», отличающихся принципиально разными темпами, моделями и стратегиями развития.

Двойственная природа империи традиционно подчеркивается исследователями: «…империя воплощает в себе мрачную тотальность неограниченного господства и принуждения – но она же оказывается синонимом неуклюжего неологизма «мир – цивилизация», выступая в роли объединяющего начала ойкумены, окруженной разрушительной стихией хаоса и варварства… Империя – это "тюрьма народов", но она же и гарант сохранения местной самобытности перед лицом любых унификационных проектов». В качестве основного признака империи указывается также на ее агрессивную внешнюю, обычно захватническую политику, поэтому зачастую государство, активно защищающее свои интересы на международной арене, негативно оценивается как «имперское». Одновременно важным признаком империи является ее